zwiększającą się liczbą izb, cena maleje. Może to być również technologia budowy i wiek budynków, co w badaniu zostało pominięte.

**Streszczenie**

W artykule dokonano oceny wpływu poszczególnych elementów infrastruktury zarówno technicznej, jak i społeczno – usługowej, na wartość nieruchomości lokalowych na Ursynowie w 2009 roku. Główny nacisk położono przede wszystkim na rozpoznanie rynku lokalnego oraz na ustalenie wag cech rynkowych i wskaźnika preferencji.

**LITERATURA**

1. Gralak A., *Geografia społeczno – ekonomiczna (materiały do wykładu)*, SGGW, Warszawa, 2008.
2. Kowalewska D., *Preferencje potencjalnych nabywców mieszkań na przykładzie warszawskiego rynku mieszkaniowego*, praca inżynierska, SGGW, Warszawa, 2011.
3. Kucharska – Stasiak E., *Nieruchomość w gospodarce rynkowej*, PWN, Warszawa, 2006.
4. Mączyńska E., *Ile jest warta nieruchomość*, Poltext, Warszawa, 2005.
5. Rybicka A., *Wpływ wybranych elementów infrastruktury na wartość nieruchomości,* praca inżynierska, SGGW, Warszawa, 2011
6. Ustawa z dnia 21 sierpnia 1997 roku o gospodarce nieruchomościami Dz. U. z 2004 roku nr 261, poz. 2603.

УДК 316.7

# ПРАБЛЕМЫ РАЗВІЦЦЯ САЦЫЯЛОГІІ МАСТАЦТВА

**С.М. Янчалоўская**
УА «Гродзенскі дзяржаўны аграрны ўніверсітэт»
г. Гродна, Рэспубліка Беларусь

В статье рассматриваются проблемы развития социологии искусства. Кратко характеризуются основные исторические тенденции становления данной дисциплины. Выделяются подходы к определению её объекта, предмета и границ исследования. Автор приходит к выводу, что социология искусства – специальная отрасль социологии, которая изучает художественную жизнь общества, социальных общностей и личностей как подсистему общества в целом.

In article problems of progress of sociology of art are considered. The basic historical tendencies of development of the given discipline are briefly characterized. Approaches to definition of its object, subject matter and borders of research are allocated. The author comes to conclusion, that sociology of art – special branch of sociology which studies an art life of a society, social generalities and persons as a subsystem of a society as a whole.

Лёс мастацтва ў кожнай эпосе быў вельмі складаным, а ў наш час стаў надзвычай супярэчлівым. Стагоддзі разважанняў былі прысвечаны асэнсаванню той ролі, якую адыгрывае мастацтва ў жыцці чалавека і грамадства. Яны прывялі да ўсведамлення, што мастацтва – гэта не толькі ўвасабленне анталагічнай гармоніі сусвету, але і якасная характарыстыка разумнага соцыума, які павінен вырашаць актуальныя

РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

праблемы перадачы найбольш важнай сацыяльнай інфармацыі і вопыта паследуючым пакаленням.

Таму ў гуманітарных ведах сфарміраваўся спецыяльны даследчыцкі накірунак – сацыялогія мастацтва, – які імкнецца пранікнуць у сферу мастацтва не толькі як у экзістэнцыяльную структуру чалавечага быцця, але, галоўным чынам, як у сацыяльны фенамен, што выступае носьбітам інфармацыі аб формах узаемадзеяння чалавека, грамадства і культуры.

Сучасныя даследчыкі сацыялогіі мастацтва лічаць, што ў якасці самастойнай дысцыпліны яна фарміруецца ўжо ў сярэдзіне 19 ст. У гэты перыяд адбываецца вылучэнне сацыяльнай праблематыкі мастацтва ў асобны раздзел, які раней уключаўся ў эстэтычныя і мастацтвазнаўчыя тэорыі. У цэлым у гісторыі сацыялогіі мастацтва назіраюцца дзве асноўныя тэндэнцыі – крытычнае самаабмежаванне і канкрэтызацыя дадзенай дысцыпліны [1, 2].

У працэсе крытычнага самаабмежавання сацыялогія мастацтва 19 ст. разглядала праблемы ўзаемадзеяння мастацтва і дзяржавы, сувязь мастацтва з палітычнымі пераўтварэннямі грамадства, залежнасці паміж светапоглядам грамадства, зместам мастацкага твора і яго мастацкай формай (Г.В.Ф. Гегель, Р. Вагнер, К. Маркс, І. Тэн). Сацыялогія мастацтва 20 ст. імкнулася выявіць спецыфічны прадмет свайго даследавання, што знайшло адлюстраванне ў размежаванні эстэтычных і пазаэстэтычных фактараў развіцця мастацтва (Ш. Дало, А. Хаузер). У заходняй сацыялогіі мастацтва вылучыліся тры асноўныя падыходы: сацыялагічны рэдукцыянізм (В. Гаузенштэйн, Л. Шукінг), інстытуцыяналізм (Т. Адарно, Л. Лёвенталь, Х. Данкан), эмпірычны падыход (А. Зільберман, Р. Кёніг) [3].

Тэндэнцыя канкрэтызацыі сацыялогіі мастацтва 20 ст. назіралася ў працэсе дыферэнцыяцыі яе на шэраг дысцыплін, якія аналізуюць сувязь розных відаў мастацтва з сацыяльным жыццём. Адной з самых распрацаваных была сацыялогія літаратуры, якая даследавала ўзаемаадносіны паміж пісьменнікам, творам і публікай, адлюстраванне ў літаратуры каштоўнасцей і стэрэатыпаў масавага чытача (Р. Эскарпі, Л. Гольдман, Б. Берэльсон, Л. Лёвенталь). Акрамя таго, у якасці самастойных дысцыплін скláліся сацыялогія музыкі і сацыялогія тэатра (Т. Адарно, Ж. Дзювіньё). Сведчаннем канкрэтызацыі сацыялогіі мастацтва з’яўляецца аналіз мастацтва з пункту гледжання адлюстравання ў ім спецыфічных сацыяльных працэсаў, цікавасць да функцый мастака ў сацыяльных інстытутах, узаемаадносін сацыяльных арганізацый і творчых саюзаў, ролі цэнзуры і выдавецтваў у мастацкім жыцці [4].



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

У Расіі ў пачатку 20 ст. сацыяльныя праблемы мастацтва разглядаліся з пазіцый марксізму ў формах эканамічнага і класавага дэтэрмінізму (Г.В. Плеханаў, В.М. Фрычэ, І.І. Іоффе). У перыяд сталінізму сацыялагічны падыход да даследавання мастацтва савецкія ідэёлагі абвясцілі “вульгарным”, а сацыялогію мастацтва – буржуазнай навукай. Адраджэнне статуса сацыялогіі мастацтва ў расійскай навуцы другой паловы 20 ст. звязана са зняццем забароны з сацыялогіі, распаўсюджваннем сацыялагічных даследаванняў. Развіццё сацыялогіі мастацтва ў Расіі ішло па двух асноўных напрамках: вызначэнне яе прадмета і межаў, распрацаванне метадалогіі эмпірычных сацыялагічных даследаванняў мастацкіх з’яў (Ю.В. Пяроў, Ю.М. Давыдаў, С.Н. Плотнікаў). Сярод найбольш актуальных тэм сучаснай сацыялогіі мастацтва – адносіны мастацтва і сродкаў масавай камунікацыі, мастацкія творы як дакументы сацыялагічнага аналізу склаўшыхся нормаў і каштоўнасцей грамадства [3].

У цэлым сацыялогія мастацтва вызначаецца як даследчыцкі накірунак, які вывучае разнастайныя формы ўзаемадзеяння мастацтва і грамадства, праблемы сацыяльнага функцыянавання мастацтва. Але само спалучэнне сацыялогіі і мастацтва ў назве дысцыпліны сведчыць аб складаных міждысцыплінарных узаемаадносінах паміж тэорыяй і гісторыяй мастацтва, з аднаго боку, і тэарэтычнай і эмпірычнай сацыялогіяй, з другога. У сучаснай сацыялогіі мастацтва застаецца праблемным вызначэнне прадмета і межаў дадзенай навукі.

Пры вызначэнні прадмета сацыялогіі мастацтва можна вылучыць два асноўных падыхода. Першы імкнецца адшукаць яго спецыфіку ў мастацтве, падкрэсліваючы, што сацыялогія мастацтва – гэта частка эстэтыкі і мастацтвазнаўства (Ю.Б. Бораў). Другі – у сацыялогіі, вызначаючы сацыялогію мастацтва спецыяльнай галіной сацыялогіі, якая абапіраецца на яе тэарэтыка-метадалагічныя асновы (Ю.В. Пяроў) [4,5].

Праблемы размежавання сацыялогіі мастацтва і эстэтыкі датычацца і асноўных задач дадзеных навук. Некаторыя даследчыкі выключаюць з сацыялогіі мастацтва ўнутраны аналіз мастацкага твора, вызначаючы яго прэрагатывай эстэтыкі (Ю.В. Пяроў). Іншыя сцвярджаюць, што сацыялогія мастацтва павінна пранікаць у структуру мастацкага твора, аднак яе галоўнымі задачамі вылучаюць даследаванне камунікацыі, якая складваецца ў адносінах да мастацтва, і яго функцыянавання ў грамадсве як спецыфічнай сацыяльнай падсістэмы (Ю.Н. Давыдаў) [5, 6].

Не менш складанай з’яўляецца праблема размежавання сацыялогіі мастацтва і сацыялогіі культуры, паколькі некаторыя



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

даследчыкі вызначаюць аб'ектам сацыялогіі мастацтва мастацкую культуру грамадства, а прадметам – яе структурна-функцыянальнае даследаванне (С.Н. Плотнікаў). У сацыялогіі мастацкая культура вывучаецца на трох узроўнях: агульнасацыялагічным, калі яна разглядаецца як элемент сістэмы грамадства; спецыяльна сацыялагічным, дзе даследуюцца сацыяльныя заканамернасці функцыянавання і развіцця мастацкай культуры; эмпірыка-сацыялагічным, які прадугледжвае аналіз дадзеных аб функцыянаванні асобных відаў і формаў мастацкай культуры [7, с. 13-14].

У мэтах размежавання сацыялогіі мастацтва і сацыялогіі культуры было прапанавана выкарыстоўваць у якасці паняцця, якое падкрэслівае спецыфіку аб'екта сацыялогіі мастацтва, азначэнне "мастацкае жыццё грамадства", а ў якасці прадмета – даследаванне мастацкага жыцця грамадства як сістэмы, ядро якой складае мастацтва, а ў якасці элементаў выступаюць мастацкія каштоўнасці грамадства, усе віды звязанай з мастацтвам дзейнасці, усе суб'екты такой дзейнасці, мастацкія інстытуты (Ю.В. Пяроў). Увядзенне ў сацыялогію мастацтва такіх сацыялагічных катэгорый, як "жыццё грамадства", "сацыяльныя функцыі", "сацыяльныя інстытуты", "суб'екты грамадскіх адносін і дзейнасці" надае гэтай галіне ведаў сацыялагічную значнасць і дапамагае растлумачыць спецыфіку яе прадмета ў адрозненні ад прадмета эстэтыкі і мастацтвазнаўства [5, с. 9-10].

Адзін з найбольш цікавых сучасных даследчыкаў сацыялогіі мастацтва М.Б.Глотаў прапануе для вызначэння яе прадмета выкарыстоўваць інтэгруючую для паняццяў "мастацкая культура" і "мастацкае жыццё" катэгорыю "мастацкі свет". На аснове сістэмнага падыхода ён вызначае мастацкі свет грамадства як сістэму трох кампанентаў: сацыяльных функцый мастацтва, мастацкай культуры грамадства і мастацкага жыцця грамадства. У гэтай сістэме сацыяльныя функцыі мастацтва выступаюць у якасці сістэмаўтвараючага фактара, мастацкая культура прадстаўляе мастацкі свет грамадства ў статыцы, а мастацкае жыццё – у дынаміцы [8].

Кожны з асноўных кампанентаў мастацкага свету грамадства, у сваю чаргу, уяўляе сабой сістэму з уласцівай ёй структурай. Структуру сацыяльных функцый мастацтва складаюць: пазнаваўчая, каштоўнасная, стваральная, камунікатыўная, геданістычная функцыі, пры гэтым апошняя выступае ў якасці інтэгруючай. Мастацкая культура грамадства вызначаецца як сістэма сацыяльных інстытутаў, а ў якасці структурных кампанентаў яе будовы вылучаюцца: мастацкая вытворчасць, мастацкая камунікацыя, мастацкае пазнанне, мастацкая



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

крытыка. Мастацкае жыццё грамадства вызначаецца як гістарычна абумоўлены спосаб функцыянавання і ўзнаўлення мастацкай культуры грамадства, а структура мастацкага жыцця сцвярджаецца ізаморфнай структурай яго мастацкай культуры. Галоўнае адрозненне паміж будовай мастацкай культуры і мастацкага жыцця грамадства заключаецца ў тым, што ў якасці элементаў першай выступаюць сацыяльныя інстытуты, а другой – сацыяльныя працэсы [8].

Аўтар прытрымліваецца пазіцыі, якая выступае за сацыялагічны статус сацыялогіі мастацтва. Мастацтва з'яўляецца аб'ектам даследавання эстэтыкі і мастацтвазнаўства. Спецыфічным аб'ектам сацыялогіі мастацтва мэтазгодна вылучаць мастацкае жыццё грамадства, а прадметам – даследаванне мастацкага жыцця грамадства як сістэмы мастацкіх каштоўнасцяў, сацыяльных функцый мастацтва, мастацкай дзейнасці, мастацкіх інстытутаў. Такім чынам, можна вызначыць сацыялогію мастацтва як спецыяльную галіну сацыялогіі, якая вывучае мастацкае жыццё грамадства, сацыяльных супольнасцей і асобаў, як падсістэму грамадства ў цэлым. Дадзеная пазіцыя дазваляе адмежаваць сацыялогію мастацтва як ад эстэтыкі і мастацтвазнаўства, так і ад сацыялогіі культуры, і выкарастоўваць дасягненні сацыялогіі ў якасці тэарэтыка-метадалогічнай асновы даследавання мастацкага жыцця грамадства. Асабліва актуальным гэта выглядае для беларускай навукі, дзе дадзены напрамак з'яўляецца практычна нераспрацаваным.

**ЛІТАРАТУРА**

1. Хренов, Н.А., Дуков, Е.В., Жидков, В.С., Соколов, К.Б. Введение в социологию искусства / Н.А.Хренов, Е.В.Дуков, В.С.Жидков, К.Б.Соколов. – Санкт-Петербург: Алетейя, 2001. – 256 с.
2. Попов, Е.А. Социология искусства: проблема становления / Е.А.Попов // Социс. – 2007. – № 9. – С. 118-124.
3. Кривцун, О.А. Социология искусства / О.А.Кривцун // Эстетика. – М.: Аспект Пресс, 1998. – С. 203-250.
4. Борев, Ю.Б. Эстетика – социология искусства / Ю.Б.Борев // Эстетика. – Смоленск: Русич, 1997. – С. 221-282.
5. Перов, Ю.В. Художественная жизнь общества как объект социологии искусства / Ю.В.Перов. – Ленинград: Изд-во ЛГУ, 1980 – 240 с.
6. Давыдов, Ю.Н. Искусство как социологический феномен / Ю.Н.Давыдов. – М.: Наука, 1968. – 288 с.
7. Плотников, С.Н. Проблемы социологии художественной культуры / С.Н.Плотников. – М.: Знание, 1980. – 64 с.
8. Глотов, М.Б. Границы предмета социологии искусства / М.Б.Глотов // Русский гуманитарный интернет-университет [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.i-u.ru/biblio/archive/glotov_granicipredmetasociologii/default.aspx. – Дата доступа: 5.02.2011.



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ